# Выстаўка ў бібліятэцы імені В. І. Леніна

Сёння ў Дзяржаўнай бібліятэцы імені В. І. Леніна (Мінск) адкрываецца вялікая выстаўка, прысвечаная надыходзячаму Дню савецкай авіяцыі — 18 жніўня. Шматлікія фотаздымкі і літаратура адлюстроўваюць сілу і магутнасць сталінскай авіяцыі, расказваюць аб слаўных гордых сокалах краіны соцыялізма.

Выстаўка паказвае гераічнае мінулае савецкай авіяцыі, яе выдатную ролю ў разгроме японскіх самураяў ля возера Хасан. Спецыяльны раздзел прысвечан лётчыкам—Героям Савецкага Саюза. Тут прадстаўлены кнігі таварышоў Вадап'янава, Чкалава, Расковай, Кокінакі і інш. Гэтыя кнігі знаёмяць з гістарычнымі подвігамі сталінскіх сокалаў, якія заваявалі Паўночны полюс, праклалі новы паветраны шлях з Масквы ў Злучаныя Штаты Амерыкі.

Рад матэрыялаў выстаўкі знаёміць з штодзённым бытам і вучобай савецкіх лётчыкаў.